# Гісторыя павінна быць аб'ектыўнай

**Захаванне аб'ектыўнай гістарычнай памяці і ўклад кожнай з постсавецкіх рэспублік у Перамогу над фашызмам — гэтыя і іншыя пытанні на працягу тыдня будуць абмяркоўвацца ў беларускай сталіцы. Адкрыццё міжнароднай школы гісторыкаў «Савецкі саюз у Другой сусветнай вайне: актуальныя праблемы гісторыі і гістарычнай памяці», прысвечанай 70-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, адбылося ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

— Падобныя сустрэчы гісторыкаў вельмі неабходныя, — лічыць **дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.** — Каб навукоўцы мелі магчымасць кантактаваць, узгадняць свае пазіцыі, дзяліцца новымі напрацоўкамі. Не сакрэт, што адкрываюцца архіўныя дакументы, з'яўляюцца цікавыя публікацыі, якія дазваляюць па-іншаму пагледзець на тыя або іншыя падзеі. Аднаўляюцца новыя прозвішчы, якія не былі ў свой час вядомымі, удакладняюцца некаторыя лічбы. Праблемы, якія ў першую чаргу патрабуюць абмеркавання, звязаны з захаваннем аб'ектыўнай памяці аб гісторыі Другой сусветнай вайны. Не сакрэт, што фактычна ўвесь час і асабліва цяпер робяцца спробы перагледзець, перапісаць ролю савецкага народа ў дасягненні Вялікай Перамогі. І справа гонару краін, якія з'яўляюцца нашчадкамі Савецкага Саюза, адстаяць памяць пра нашых продкаў, каб, не саромеючыся гэтага (а яно так і ёсць), мы на ўвесь свет заяўлялі, што савецкі народ унёс вырашальны ўклад у агульную перамогу.

Як перакананы **намеснік дырэктара Інстытута ўсеагульнай гісторыі Расійскай акадэміі навук Віктар ІШЧАНКА,** гістарычная памяць вельмі выбарачная, і ў кожнага народа, дзяржавы свае ўяўленні пра тую ці іншую падзею, свая інтэрпрэтацыя. «Гэта цэлы комплекс праблем і поглядаў на іх, і яны розныя, — адзначае Віктар Ішчанка. — Гісторыя як навука павінна быць адзінай, аб'ектыўнай».

Міжнародная школа гісторыкаў праводзіцца пад патранажам Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД. У ёй прымае ўдзел каля 70 маладых навукоўцаў і выкладчыкаў — прадстаўнікоў акадэмічных і адукацыйных устаноў гістарычнага профілю практычна ўсіх краін СНД. Маладыя гісторыкі з Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Узбекістана і Украіны падзеляцца сваімі навуковымі напрацоўкамі па тэме гісторыі Другой сусветнай вайны, абмяняюцца ўласным вопытам.

# МІР ДЗЕЛЯ ЖЫЦЦЯ

**Ваенна-гістарычная акцыя-паездка «Мы памятаем... Так пачыналася вайна» стартуе 20 чэрвеня. Па традыцыі ў межах праекта «Мір дзеля жыцця» ўдзельнікі з Беларусі і Расіі наведаюць месцы, звязаныя з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі нашай краіны.**

Сёлета каля 70 чалавек — школьнікаў, прадстаўнікоў ваенна-патрыятычных клубаў, навучальных устаноў, а таксама ветэранскіх арганізацый і Расваенцэнтра пры ўрадзе Расійскай Федэрацыі — пабываюць у памятных месцах Брэста, Мінска, Магілёва і Гомеля. Патрыятычная ініцыятыва — працяг цыкла памятных мерапрыемстваў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны як у Саюзнай дзяржаве, так і ў цэлым у СНД.

■ Дарогі вайны

# 14 СМЕЛЫХ

## ПА ТЫСЯЧАКІЛАМЕТРОВЫМ ШЛЯХУ СТАТАК З 700 ГАЛОЎ ГНАЛІ ЎСЯГО НЕКАЛЬКІ ПАДЛЕТКАЎ І ЖАНЧЫН

**З Нінай Міхайлаўнай Сакаловай мы пазнаёміліся па тэлефоне. Яна прасіла рэдакцыю апублікаваць яе артыкулы пра родных, якія адважна змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны. І вельмі лаканічна сказала пра сябе, 16-гадовую дзяўчыну, якая разам з маці, маленькай сястрычкай і яшчэ некалькімі людзьмі арганізоўвалі эвакуацыю жывёл. Я не паверыла сваім вушам. Не раз чула пра гэтую дзіўную гісторыю, але нават уявіць не магла, што на працягу пяці месяцаў па тысячакіламетровай дарозе статак з 700 галоў гналі ўсяго некалькі падлеткаў і жанчын. Гналі, каб зберагчы народнае дабро ад вайны...**

### А БАЦЬКА НЕ ВЯРНУЎСЯ...

У горад Ветка, што на Гомельшчыне, сям'я Барадзіных пераехала задоўга да вайны. Міхаіл Кірэевіч і Пелагея Кандратаўна працавалі ў калгасе «Пралетарская перамога», які славіўся развіццём жывёлагадоўлі. Выхоўвалі дзяцей — Ніну, Пятра і Раісу. Сям'я была вельмі дружнай. Па вечарах ігралі на гітары, спявалі песні. Здавалася, спакойнае, шчаслівае жыццё нішто не можа парушыць...

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, старэйшай Ніне было 16 гадоў. Бацьку, удзельніка Першай сусветнай, у Чырвоную Армію прызвалі 3 ліпеня 1941 года.

— Калі ён ішоў на фронт, яго ўсе праводзілі, — успамінае Ніна Міхайлаўна. — А я не пайшла. І дагэтуль не магу сабе гэтага прабачыць... Бацька яшчэ спытаў: «Ніна, а ты мяне не пойдзеш выпраўляць?» А я — у слёзы. Баялася настаўнікаў, якія ўбачаць, што плачу. Не магла тады нават падумаць, што бацька можа не вярнуцца.

Больш яны яго ніколі не бачылі. «Прапаў без вестак», — паведаміла франтавая пошта. І толькі потым яны даведаліся, што бацька, радавы 2-га стралковага палка, пры абароне Гомеля трапіў у нямецкі палон. Загінуў 30 студзеня 1942 года ў шталагу № 312, у Торуні (Польшча). Быццам просячы прабачэння за тое, што не правяла яго туды, ужо праз шмат гадоў пасля вайны Ніна Міхайлаўна разам з сястрой паехала ў Торунь. Тут, на месцы былога канцлагера для ваеннапалонных, і адбылася яе апошняя сустрэча з бацькам.

### «КАМПАЗІТАР» ПАЙШОЎ НА ФРОНТ

Пётр Барадзін, брат Ніны Міхайлаўны, у ноч з 21 на 22 чэрвеня 1941 года разам з аднакласнікамі якраз святкавалі выпускны вечар. Яны, напэўна, аднымі з першых чулі гарматныя залпы, разрывы снарадаў і бомбаў. Праўда, падумалі, што гэта салют у гонар выпускнікоў.

На другі дзень учарашнія дзесяцікласнікі пайшлі ў ваенкамат і адразу ж уключыліся ў справу па ахове мясцовых аб'ектаў: вадакачкі, электрастанцыі, моста праз раку Сож. Яшчэ вясной некаторыя з іх адправілі дакументы ў Ленінград — у Вышэйшае ваенна-марское інжынернае вучылішча імя Дзяржынскага. Але на здачу ўступных іспытаў запрасілі толькі дваіх, у тым ліку Пятра. Нягледзячы на тое, што пачалася вайна, у вучылішчы быў вялікі конкурс. Але два «кампазітары», як ахрысцілі курсанты Барадзіна і Пушкова, былі залічаны на першы курс.

У канцы жніўня ўсіх першакурснікаў адправілі ў Рыбінск, а адтуль параходам — у Праўдзінск, дзе да лістапада 1941 года яны асвойвалі вайсковую навуку. Пётр вырашыў стаць кулямётчыкам. Тады ён, як і ўсе таварышы, быў пад уражаннем ад фільма «Чапаеў». Адразу пасля парада на Краснай плошчы ў Маскве 7 лістапада 1941 года курсантаў адправілі на фронт. Пётр трапіў у 66-ю марскую стралковую брыгаду, якую сфарміравалі ў Мардовіі. Са снежня 1941-га па студзень 1944-га Пётр Барадзін камандаваў кулямётным аддзяленнем на Карэльскім, Данскім, Сталінградскім, Калінінскім, Паўночна-Заходнім і Прыбалтыйскім франтах. Падчас наступлення пад Невелем быў цяжка паранены. Выжыў толькі таму, што медсястра



Фота з архіва Ніны САКАЛОВАЙ.

Тут, на месцы былога канцлагера для ваеннапалонных у Торуні, і адбылася апошняя сустрэча Ніны Міхайлаўны з бацькам.

адшукала яго сярод мёртвых. Пасля таго, як выйшаў са шпіталя, служыў у падраздзяленні супрацьтанкавай знішчальнай артылерыі. Удзельнічаў у Яска-Кішынёўскай аперацыі, вызваляў Румынію, Беларусь, Югаславію, Венгрыю. За вайну — чатыры раненні. Узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, шматлікімі медалямі.

### НАРОДНАЕ ДАБРО

З пачаткам Вялікай Айчыннай жыццё ў Ветцы перайшло на ваенны лад. Кожны, хто мог, імкнуўся дапамагчы фронту. Старшакласнікі рамантавалі прасёлачныя дарогі. Сярод іх была і Ніна Барадзіна. Цягалі ў вёдрах пясок — засыпалі ямы, каб не трэсла параненых, якіх будуць везці па дарозе.



Пётр Барадзін узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі.

У Ветцы знаходзіўся шпіталь. Жанчыны і дзяўчаты мылі бінты, ручнікі. Бялізну прывозілі на Сож, давалі кавалак мыла. Сушылі ўсё на траве. «Аднойчы прыбягае мая сяброўка Ганначка і кажа мне, каб збіралася дахаты: маўляў, мы заўтра эвакуіруемся, — працягвае жанчына. — Мы дагэтуль нават слова такога не чулі. Куды?»

Паступіў загад — эвакуіраваць статак. Жывёла ў калгасе «Пралетарская перамога» была вельмі каштоўная. Яе яшчэ да вайны закупілі ў Германіі. Трэба было ратаваць народнае дабро.

Узначаліць эвакуацыю даручылі маці Ніны Барадзіной. Пелагея Кандратаўна была передавіком гаспадаркі, гераіняй тагачасных газет. Да вайны скончыла жывёлагадоўчую школу, працавала загадчыцай фермаў у калгасе. За самаадданую працу ў 1939 годзе ад самога Калініна атрымала ордэн «Знак Пашаны». У 1940 годзе Пелагея Барадзіна ўдзельнічала ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве, за што была ўзнагароджана медалём.

— Маці практычна не бачылі: сыходзіла рана, прыходзіла позна, калі мы ўжо спалі, — кажа Ніна Міхайлаўна. Працавала амаль без выхадных.

Пелагею Барадзіну прызначылі адказнай за статак у 700 галоў, у тым ліку за 300 авечак і 14 коней. Фарміравала брыгаду таксама яна. Усяго — 14 чалавек: дзесяць камсамольцаў-падлеткаў, у тым ліку Ніна Барадзіна, тры жанчыны і адзінаццацігадовая Рая, малодшая дачка Пелагеі Кандратаўны. У дарогу выправіліся на досвітку 18 ліпеня 1941 года.

— На воз паставілі куфар з самым неабходным (жылі ж небагата), — успамінае Ніна Сакалова. — Не забыліся і пра гітару: а раптам Пецю сустрэнем? Мы вельмі любілі брата. Я нават яго касцюмчык у куфар паклала. Для таго, каб раптам яму, параненаму, было што апрануць. Не сустрэлі. Так і падарожнічала з намі гітара пяць месяцаў.

### АДКАЗНАЯ СПРАВА

Рухаліся на ўсход. Па прыфрантавых і тылавых дарогах. Летам пераадольвалі па 20 кіламетраў за дзень, позняй восенню і зімой не праходзілі і пятнаццаці. Іх дахам стала неба, а ложкам — трава.

— У нас было цыганскае жыццё, але жылі мы горш, чым цыганы, — расказвае Ніна Міхайлаўна. — У іх быў брызент, а мы ўвесь час — пад адкрытым небам. І ў спякоту, і ў дождж. 700 галоў ідзе, а мы за імі. Хто з пугай, хто з палкай. Аднойчы паглядзелася ў люстэрка: твар быў увесь чорны ад пылу. Хлопцы кантралявалі абстаноўку на конях. Больш за тое, трэба было знайсці вадапой, каб напаіць жывёл; добрую паляну, каб іх напасвіць. Гэта была вельмі адказная справа!

Па дарозе спыняліся ў вызначаных пунктах — звычайна ў раённых цэнтрах. Там Пелагея Барадзіна рабіла справаздачу, а ёй давалі ўказанні па маршруце далейшага руху. Падчас стаянак жанчыны даілі кароў. Малако здавалі на прыёмныя пункты. Ім паілі параненых, раздавалі мясцовым жыхарам. Таксама здавалі на пунктах падбітую або знямоглую скаціну: не ўсе жывёлы вытрымлівалі доўгі шлях. Падарожнікам там выдавалі хлеб і крупу. Больш — нічога. Трымаліся на малацэ. Штосьці з падбітай скаціны аддавалі ім. Дапамагалі з харчаваннем і мясцовыя жыхары.

— У канцы жніўня мы зразумелі, што для далейшага руху нам шмат чаго не хапае, — працягвае яна. — Тады мама адправіла ў Ветку коннікаў. Хлопцы вярнуліся назад ні з чым: да Веткі ўжо падыходзілі гітлераўцы.

### МАРЫЛІ ПАСПАЦЬ У ЛОЖКУ

Кожны дзень рухаліся. За выключэннем таго перыяду, калі жывёлы захварэлі на яшчур. Стаялі тыдзень. Лячылі статак. Дагледзелі ўсіх. Дарэчы, за ўвесь шлях па іх віне не загінула ніводнай жывёлы. Былі страты, але не ў дарозе. Жывёл, якія выглядалі знясіленымі, забіралі на месцах прыпынку.

— Самым цяжкім у дарозе было дзяжурства, — расказвае Ніна Сакалова. — Дзяжурылі ноччу, па два чалавекі. Трэба было сачыць, каб не ўцякла жывёла, каб яе не скралі. Добра, калі месяц свеціць. А калі не... Колькі радасці было, калі закрычыць певень — хутка раніца. Аднойчы напрыканцы дзяжурства бачу ляцяць самалёты. Бомбы ўпалі, на шчасце, у балота. Жывёлы як пашалелі. Ледзь супакоілі.

Восень была сырая. Ногі гразлі ў чарназёме. Жывёлы з цяжкасцю рухаліся. Багатым на сюрпрызы было і Сярэднярускае ўзвышша. Крутыя яры збівалі жывёлу з ног. А аднойчы ледзь не перакуліўся воз, у якім ехалі адказная за эвакуацыю і малая Раіса. Ратавалі ўсёй камандай. З наступленнем халадоў спыняліся ў вёсках. Размяркоўваліся па хатах. Праўда, спалі на падлозе. І вельмі марылі аб тым, каб, калі скончыцца вайна, паспаць у ложку. Калі-нікалі начавалі на печы. І гэта была ўжо раскоша.

— Зіма была вельмі лютай: маразы да 25-30 градусаў, — працягвае Ніна Міхайлаўна. — А мы зусім у лёгкай вопратцы! У жывёл ад холаду замярзалі хвасты.

### АПОШНІ ПРЫПЫНАК — НІЗОЎКА

У снежні, з прыходам моцных маразоў, вырашылі спыніць рух. Размясціліся ў сяле Нізоўка, што ў Саратаўскай вобласці. Сюды разам з жывёламі дайшлі дзевяцера. Астатнія засталіся ў Варонежскай вобласці: лячыліся ад хваробы. Тут, у Нізоўцы, былі да самага вызвалення Беларусі. Іх размеркавалі па кватэрах, забяспечылі працай у калгасе. Хлопцы неўзабаве пайшлі на фронт.

Ніна Міхайлаўна скончыла тут дзясяты клас. Вучылася разам са сваім будучым мужам. У 1943 годзе Міхаіла Сакалова прызвалі ў Чырвоную Армію: у запасны полк, які дыслакаваўся ў Сталінградзе. Мінёрам 47-й чыгуначнай брыгады 2-га Украінскага фронту прайшоў па тэрыторыі Украіны, Малдавіі, Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі, Чэхаславакіі.

Пасля вайны Міхаіл Сакалоў застаўся ў войску. Скончыў Ленінградскае вучылішча ваенных паведамленняў, чыгуначны тэхнікум транспарту. Служыў на розных пасадах ва Узброеных Сілах Савецкага Саюза. Удзельнічаў у аднаўленні і будаўніцтве ўсесаюзнай чыгункі, у тым ліку беларускай. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, 19 медалямі, памятнымі знакамі за актыўны ўдзел у будаўніцтве сярэднесібірскай магістралі, магістралі Масква — Байкал.

...Пяць месяцаў у дарозе. Пяць пройдзеных абласцей: Гомельская, Арлоўская, Курская, Варонежская і Саратаўская. Шлях даўжынёй у тысячу кіламетраў. Амаль ацалелы статак. І ўсё гэта дзякуючы 14-ці смелым.

**Вераніка КАНЮТА,**
*kanyuta@zviazda.by*



■ Святло ў акне

# Яшчэ сашчэплены нашы рукі...

**Нямоглая, абціснутая спавівальнай кашуляй старасці, маці ўжо амаль чатыры гады жыве ў горадзе, у светлым пакойчыку, дзе гадаваліся мае дочкі. Калі я, пераадольваючы не абы-які супраціў, забіраў яе з вёскі, дык падбадзёрваў сябе: «У горадзе ёй будзе лепш — у цяпле, са смачнейшым наедкам...» Якое наіўнае, як высветлілася, было гэтае прымерванне да маці побытавых выгод! Ды і цалкам не пераехала яна з вёскі, бо яшчэ не вынайшлі такой спецыяльнай легкавушкі, каб з коранем, нібы саджанец, перавезці душу.**

Маці дагэтуль так і не змагла запомніць няхітры план маёй кватэры, бо жыве толькі згадкамі свайго вясковага жыцця. Па якой простай патрэбе ёй карціць выйсці на двор, а па ваду — да калодзежа.

Я думаў, што паласую маму якімі прысмакамі, а ёй смачней за ўсё вараная з цыбулінкай ды кменам бульбачка, дзяронікі і клёцкі, дарма што куплёныя, не з печы. Садраны на тарцы ды запраўлены смятанай гурочак смачнейшы за банан... Спадзяваўся, што маці хоць напрыканцы жыцця трошкі параскашуе, а яна ўсё імкнецца, імкнецца, імкнецца затуліцца ў свёй звыкласці. Старасць, асабліва глыбокая, дзевяностагадовая, толькі азіраецца на мінулае і стараецца нават праз шчылінку не зазіраць у будучыню, каб не збянтэжыцца.

Я думаў, што вось цяпер на ўсім гатовенькім мама хоць тэлебачання нагледзіцца. Памятаю ж, як любіла яна ўрыўкамі, з даёнкай ці чапялой у руцэ, калі печ ці грубачка выцепліваліся, прыхінуцца да тэлевізара, каб хоць адным вокам зірнуць, што там робіцца ў свеце. А цяпер жа хоць цэлы дзень глядзі!..

Але мама бачыць толькі працяг даўнейшага і — аніякага распачатку.

— А-я-яй, якая барацьба ў свеце, якая калатнеча, як людцы гаруюць, — уздыхае ды хрысціцца яна.

* * *

Мама знемагае ад старасці. Ужо з цяжкасцю перасоўваецца па кватэры — не жартачкі насіць на сабе такі цяжар гадоў. Колькі месяцаў мінула, як пачаў вадзіць яе за руку. Раніцай падаю кавеньку і дапамагаю ўзняцца з ложка. Спачатку ідзём у лазеньку змыць з вачэй рэшткі сну, а потым — на кухню снедаць.

Так і тупае мама з дзвюма кавенькамі — з куплёнай і самой народжанай, у адной руцэ — выгнутая пад цесны сашчэп рукаяць, у другой — заўсёды гатовая да цёплага сашчэпу мая рука.

Мусіць, у мяне ўжо ніколі не будзе на белым свеце большай уцехі, чым вось гэтая — ад адчування сябе кавенькай у сухенькай руцэ мамы.

Маміна рука разбіта аб работу: далонь шырочанькая, усё адно як кім наўмысна звыш меры падплюшчаная. На левай руцэ, на безыменным пальцы, у яе акурат пасярэдзіне распалавінены пазногаць. Памяць далёкага дзяцінства.

...Гадкоў дзесяць было Ірынцы, калі яна ўзялася дапамагаць сваёй маці жаць жыта. А ўспрытнёнасці ж не было, а ручкі — як пруточкі, а серп важкі, для яе прынамсі, і як круцёлка, якую ў руцэ не ўтрымаць... І такі востры, ды з засечкамі! Што яму той пальчык, калі пруткія, сухія сцяблы, як у руку ўзяць, увобміг сажвыхвае.

І зрабіла на сабе маці пажыццёвую засечку. Ужо звыш васьмідзесяці гадоў на ёй.

* * *

Калі цалаваць мне маміны рукі, дык трэба пачынаць не з гэтай, з «засечкай», а з правай, у якой яна звыш паўстагоддзя таму трымала незабыўную розгу.

...Мне было ўжо гадкоў пяць. Маці перад адыходам на працу адводзіла мяне да бабулі з дзедам. І тут я раскашаваўся. Новая хата — новы свет. Да таго ж я трапляў пад не надта строгі нагляд: унукі — уцеха і пацеха, а гэтае ж не абціскаюць. А яшчэ бабе з дзедам трэба было зноў і зноў уходжвацца па гаспадарцы, раз-пораз выходзіць на дзяннік... Бабця каля печы доўга завіхалася... А мне — воля. Дык і зазіраў у цёмныя куты, у шафу, шуфляды выцягваў — паглядзець, што там ляжыць... Адным словам, панадзіўся нішпарыць, як у нас кажуць, па хаце. Вывучаў яе, не раўнуючы як каторы астраном новае сузор'е ці галактыку. А потым пачаў вышукваць featuresрознае рэчавае драбноцце, меншае за маю кішэньку, каб затуляць туды ўсё, што можна мецць за цацку.

Аднойчы я знайшоў дзедавы капейкі, і яны падаліся мне вельмі заманлівымі цацкамі. Яшчэ б! З імі ж, як я зрэдку бачыў, гулялі нават дарослыя, марудна перабіраючы іх на далоні. І капейкі, сыпанутыя са жменькі, весела зазвінелі ў маёй кішэні.

Потым я пачаў яшчэ і яшчэ ўпотайкі прыносіць дамоў ад дзеда розную драбязу, напаўняючы гэтым багаццем сваю кардонную скрыначку-схованку.

І маці ўстрывожылася. Аднойчы вечарам яна ўхапіла мяне за руку і вывела з хаты на вуліцу. На хаду адламала з куста розгачку і завяла за рог хаты, адкуль шырока адкрывалася неба з асядаючым на далёкі лес сонцам.

— Глядзі на сонейка! — з нязнанай дагэтуль злосцю прамовіла мама. — На сонейка, кажу табе! — і пачала біць розгачкай па вачах.

— А ці будзеш красці?! А ці будзеш?! Ці будзеш?!

— Не буду! Не буду, мамачка!

Матуля біла розгай па вачах, вядома, лёганька, розга хіба што кранала павекі, але было вельмі балюча — ад страху і ад ейнай рашучасці і злосці. І запамінальна. У мяне і пасёння стаіць уваччу тая розгачка: раздвоеная — дзве тоненькія жыгаўкі на адным камельчыку...

* * *

Вяду маму за руку і міжволі згадваю ейныя пажыццёвыя шчадроты, заўсёдную занепакоенасць маім лёсам, спагадлівасць і чуллівасць. І самаахвярнасць.

Калі я паступіў у інстытут, мама, якая да вайны скончыла сем класаў і лічылася ў нашай вёсцы, бадай, самай пісьменнай, была ў брыгадзе рахункаводам, кінула гэтую параўнальна лёгкую працу і, каб болей зарабляць, пайшла ў цялятніцы. Толькі б сынок не заціскаў сябе, меў які рубельчык і на кніжкі, і на кіно, і на тэатр...

Згадваю гэта са светлым сумам.

* * *

Мудрыя людзі, адсеяўшы як неабавязковыя розныя пачуццёвыя ўзрушэнні, сумятню перажыванняў і разважанняў, вызначылі простае, як праўда, і зразумелае ды неаспрэчнае для ўсіх правіла жыцця: будзь годным сынам (дачкой), выканай святы абавязак — дагледзь бацькоў у старасці!

Дзеля выканання гэтага абавязку некаторыя, чаму я быў сведкам, перапынялі вучобу ці наогул не паступалі ў інстытут, а ішлі працаваць, часам адмаўляліся ад прынаднай кар'еры, іншым разам займаліся не тым, што па душы, а тым, што не замінала гэтаму догляду.

* * *

Раз-пораз заходжу ў матулін пакойчык, які акурат насупраць майго, дзе стаіць пісьмовы стол. Калі ўбачу, як яна сядзіць на ложку, сашчапіўшы рукі, сэрца жаль заціскае. Я ведаю, што мама зноў разматвае ў думках чорны клубок памяці, выпроствае нітку, якая лучыць яе з заўчасна сканалай дачушкай Алечкай, татулькам Юстынам і мамулькай Праскоўяй, братамі Сцяпанькам і Цімачкам, з мужам Васілём... Каб перабіць гэтыя думкі, я пытаюся, ці хоча яна піць і, не пачуўшы адказу, усё адно прыношу вады, пернік ці цукерчыну... Мама рэдка калі што папросіць, не хоча лішні раз турбаваць, нагадваць пра сябе... За доўгія гады прывыкла толькі аддаваць і нічога не браць. «Вы ж са мной няньчыцеся...» — вінавата кажа яна.

Калі жонка дапаможа ёй памыцца ў лазеньцы, адзецца ў чысценькае, засцеле хрумсткую ад свежасці прасціну, маці ўздыхае: «От, каб цяпер памерці...».

Я маўчу, каўтаючы ў горле горкі камяк. Што рабіць, такое жаданне ўзнікае ў многіх людзей, якія са сваімі кіёчкамі дайшлі да парога вечнасці. Натуральна, што ўзысці на яго доўгажыхарам хочацца чыстымі і душой, і целам.

* * *

Мама, колькі жыве, баялася і баіцца за маё жыццё і такім чынам доўжыць і доўжыць свой даўнейшы страх. У маленстве, калі адганяў на пашу бацькаву Шэрку, штораз наказвала: «Ты ж не прыспешвай яе, едзь дружком, не пускай кабылку ў галоп...» Каб не зваліўся, не пабіўся...

І сёння тое самае. Збіраюся на сваю ўлюбёную раку і чую: «А з кім ты паедзеш?» — «З папом знаёмым», — адказваю. «А, тады добра». І ўсё адно нервуецца, падыходзіць да акна, выглядае з высокага паверха, ці не вяртаюся, хоць і бачыць на якіх пару метраў.

Выйду ў горад запозна — зноў на яе душы неспакой...

Святая звычка быць маці гадам непадуладная.

* * *

Калі я трохі і ведаю родную мову, дык толькі дзякуючы матулі. У школе ж вывучаў яе толькі чатыры гады, а тады з пачатковай аддалі ў сярэднюю рускамоўную, а далей — фізмат...

Хочаш ведаць мову — слухай маці, лаві натапыранымі вушамі яе спеўную гаворку, пачынаючы з калыханкі і чароўнай казкі на сон.

Глыбокая старасць матулі для мяне цяжкая тым, што мая даражэнькая стала куды менш гаваркой. Нават у звяртанні да Бога з пэўнага часу яна ўжо ўсё менш і менш вышэптвае малітвы, хіба толькі ў думках напоўніцу. Але і маўчанне — не аняменне. Калі прыслухаешся, і ў ім пачуеш цішыню родных слоў.

* * *

Чалавек нараджаецца са словам «мама» на вуснах.

Некалі мы, віцебскія мальцы-«падуросткі», у якіх яшчэ не перакіпела ваярская крывіцкая кроў продкаў, каб адчапіцца ад спадніц, называлі сваіх матуль «маткамі». «Табе дазволіла матка пайсці з намі па грыбы? Гайда, нічога страшнага, калі разок не паслухаешся...»

А тады, узросшы, калі прабіліся ўжо вусы, а падлеткавая нязграбнасць пачала пакрысе перафармоўвацца ў мужчынскую мускулістасць, матку сваю называлі «маці». «Маці, ну колькі ты мяне павучаць будзеш? Я ж дарослы ўжо!» — «Усё жыццё!» — перапоўненая ўпэўненасцю, з усмешкай адказвала яна.

Калі ж маці асунецца, а ў яе валасы густа заліпне шэрань, ласкава звяртаемся да яе словам «матуля», усё адно як атульваем мяккім кужалем пяшчоты.

А далей...

Не ведаю, ці буду я ў згадках называць сваю матулю «мамулькай». Для гэтага ўсё ж трэба мець жаноцкую чуллівасць.

**Сяргей РУБЛЕЎСКІ**

■ У госці да чытача

# ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

## Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў вёсцы, дзе жыхароў можна на пальцах пералічыць

**Тым больш прыемна, што і там, у гэтай вёсачцы Арэшанкі Віцебскага раёна, дзе ўсяго некалькі дамоў, чытаюць «Звязду». Валянціна Паўлаўна Логінава пражыла ў гэтай вёсцы ўсё жыццё. Яна шчырая прыхільніца «Звязды». З сярэдзіны 1960-х гадоў працавала і паштальёнкай, і начальнікам аддзялення сувязі... І цяпер лічыць, што «Звязда» насамрэч родная газета на роднай мове і такім чынам цалкам адпавядае свайму «дэвізу».**



Валянціна Паўлаўна ЛОГІНАВА.

А пазнаёміліся мы некалькі гадоў таму. Перад навагоднім святам Валянціна Паўлаўна, старэйшына вёскі, выйграла па выніках латарэі для падпісчыкаў «Звязды» параварку. Тады яна шчыра падзякавала сваёй любімай «Звяздзе» за падарунак і папрасіла ў наступнай публікацыі адзначыць, якія аўтары ў газеце ёй падабаюцца. А потым нават пакрыўдзілася за тое, што не ўсіх пахваліў ад яе імя.



Іван Аляксеевіч.

— Добра, што прыехалі! — вітае нас пенсіянерка. — Праўда муж мой, Іван Аляксеевіч, зусім хворы, інвалід 2-й групы... «Звязда» і іншыя газеты шмат пішуць пра вайну. Спадзяюся, дажывём да таго часу, калі ўсе, з каго здзекаваліся фашысты, будуць прыраўнаваны да пацярпелых.

Яна паказала мне публікацыі з газет, прысвечаныя тэме вайны, жудасныя падрабязнасці таго, як знішчалі вёскі, як катавалі нашых людзей. Сярод публікацый ёсць і пра яе, пра мужа...

— Я нарадзіўся ў 1935 годзе. Вайна застала нас каля мяжы з Польшчай. Бацька ў арміі служыў, а мама была хатняй гаспадыняй. Добра памятаю першы дзень вайны. Бацька прыйшоў дамоў і сказаў, што нам трэба ехаць на цягніку. Гэта была наша апошняя сустрэча. Мы з мамай і братам, а яму тады ўсяго 4 гады было, паехалі ў тыл. З паветра цягнік пастаянна абстрэльвалі. У вагоне было горача і не хапала вады, — дзеліцца ўспамінамі Іван Аляксеевіч.

Падчас нашай першай сустрэчы Валянціна Паўлаўна сказала, што ўсё ніяк не можа дабіцца, каб ля павароту на вёску спыняліся аўтобусы, якія ходзяць на Сураж. Цяпер, калі былі ў яе ў гасцях, паказала мне афіцыйныя адказы з розных інстанцый. У лістах напісана, што, маўляў, няма тэхнічнай магчымасці арганізаваць прыпынак.

— А ўсяго толькі і трэба зрабіць «пляцоўку», вышэйшую за ўзровень дарогі. Хай і без даху. Але ж галоўнае, каб тыя, хто жыве ў нашай вёсачцы, маглі спакойна прыйсці да таго прыпынку і сесці на транспарт. Ісці да Суража пешшу мне, старой, цяжка. Ды і вы паспрабуйце... Дойдзеш да асфальту, чакаеш з надзеяй, а аўтобус не спыняецца. У Суражы — а ён адсюль у двух кіламетрах — і медыцынская ўстанова, аптэка, крама, царква, а ў нас нічога гэтага няма, — тлумачыць жанчына.

Яна шчыра спадзяецца, што «Звязда» дапаможа вырашыць гэту праблему. На працу аўтакрамы, мабільнай пошты не скардзіцца: прывязуць што трэба і своечасова. Валянціна Паўлаўна ўпэўнена, што калі ў вёсачцы жыве адна сям'я, нельга лічыць, што такі населены пункт вымірае. А можа, нехта яшчэ зоймецца агратурызмам. І гісторыя такіх вёсак, як Арэшанкі, будзе працягвацца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
*Віцебскі раён*



Муж і жонка беражліва захоўваюць дакументы, а таксама розныя публікацыі пра іх і пра тое, што іх цікавіць.

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.